Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар К.Р. Расіцан

ПАЛАЖЭННЕ
01.02.2024 № 1
г. Гродна

аб конкурсе электронных віктарын «Са знакам якасці»

1 . Агульныя палажэнні

1.1. Дадзенае Палажэнне рэгламентуе парадак правядзення і ўмовы конкурсу электронных віктарын «Са знакам якасці» (далей – конкурс) да аб'яўленага ў Рэспубліцы Беларусь Года якасці.
1.2. Арганізатар конкурсу – дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» (далей – ЦБС г. Гродна).

2. Мэта і задачы конкурсу

2.1. Мэта конкурсу: стварэнне прывабнага іміджу бібліятэк сярод карыстальнікаў і павелічэнне колькасці віртуальных зваротаў шляхам стварэння электронных віктарын ці крыжаванак.

2.2. Асноўныя задачы конкурсу:

- Стварэнне ўласных інфармацыйных рэсурсаў для прасоўвання чытання сярод карыстальнікаў;
- Развіццё навыкаў працы з электроннымі рэсурсамі;
- Стымуляванне творчых здольнасцяў бібліятэчных работнікаў;
- Актывізацыя пазнавальнай дзейнасці карыстальнікаў бібліятэк і тым самым зварот да бібліятэчных крыніц інфармацыі.

3. Удзельнікі конкурсу

3.1. Удзельнікамі Конкурсу могуць быць структурныя падраздзяленні ЦБС г. Гродна і бібліятэчныя супрацоўнікі. Прымаюцца як індывідуальныя, так і групавыя работы.

4 . Умовы правядзення

4.1. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца віртуальныя віктарыны, крыжаванкі, якія павінны быць выкананы ў адным з анлайн-сэрвісаў для стварэння інтэрактыўных заданняў: LearningApps, Wizer, Wordwall, Genially.
4.2. Вітаецца прымяненне тэхнічных прыёмаў, візуальных вобразаў, якія дазваляюць папулярызаваць лепшыя і якасныя дасягненні беларусаў у навуцы, культуры і мастацтве, абудзіць цікавасць у карыстальніка да чытання.

5 . Парадак і тэрміны правядзення конкурсу

5.1. Падрыхтоўка творчых прац удзельнікамі конкурсу з 1 лютага па 31 сакавіка 2024 г.
5.2. Падвядзенне вынікаў конкурсу, ацэнка прадстаўленых работ – да 10 красавіка 2024 года.
5.3. Крытэрыі ацэнкі прац:
- Адпаведнасць работы заяўленай тэме;
- Дакладнасць фармулёўкі пытанняў, дакладнасць інфармацыі;
- Візуальная зручнасць успрымання матэрыялу, дызайн;
- Тэхнічная рэалізацыя працы і складанасць выканання;
- Перспектыўнасць выкарыстання.

5.4. Конкурсныя работы будуць ацэньвацца журы.
5.5. Па выніках конкурсу журы вызначае пераможцаў – I, II і III месца.
5.6. Імёны пераможцаў будуць апублікаваныя на сайце ЦБС г. Гродна.
5.7. Адрас для перасылкі работ: obmgcb@gmail.com

Наземцава Н.Ю., тэлефон 695966